

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 24 (611) 2 ЛІПЕНЯ 2003 г.

Навіны з Маладзечна

10 чэрвеня 2003 года ў Маладзечне адбыўся справаздачна-выбарчы сход сяброў Маладзечанскай гарадской арганізацыі. Варта адзначыць, што сход быў надта напружаным і няпростым. Шмат праблемаў назбіралася, узнік канфлікт паміж некаторымі сябрамі рады гарадской арганізацыі. Па прызнанні саміх радцаў па працягу апошніх двух гадоў амаль ніякай працы ў Маладзечне не вялося. Некаторыя спробы палепшыць сітуацыю з пашырэннем выкарыстання беларускай мовы ў горадзе былі малаэфектыўнымі. У выніку ўся візуальная інфармацыя (акрамя шыльдаў з назвамі вуліц) зроблена з ігнараваннем беларускай мовы. У горадзе працуе толькі дзве сярэднія навучальныя ўстановы з беларускай мовай навучання. На шчасце, прысутныя на сходзе сябры, усвядоміўшы складанасць становішча ў якім апынулася гарадская арганізацыя, здолелі пераступіць цераз свае ўласныя амбіцыі і крыўды, і правялі сход у вельмі канструктыўным рэчышчы. Была абраная новая рада Маладзечанскай гарадской арганізацыі ў складзе 7 чалавек. Ачоліў арганізацыю Трошчанка Уладзімір Міхайлавіч. У склад новай рады быў абраны і галоўны рэдактар папулярнага на Маладзечаншчыне беларускамоўнага выдання "Рэгіянальная газета" – Алесь Манцэвіч. Падчас сходу ўзнавілі сваё сяброўства ў арганізацыі 9 чалавек, і цяпер агульная колькасць ТБМ-цаў у горадзе складае 47 чалавек.

Кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы жадае новай радзе і старшыні Маладзечанскай гарадской арганізацыі плёну ў працы. Упэўненыя таксама, што і былы старшыня Сяргей Юркевіч здолее арганізаваць эфектыўную дзейнасць сябраў моладзевай суполкі на карысць нашай агульнай справе адраджэння беларускай мовы.

Намеснік старшыні ТБМ Сяргей Кручкоў.

Выдадзена ТБМ



Вяртанне слаўнага імя

ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" выпусціла юбілейны каляндарык, прысвечаны выдатнаму дзеячу навукі і культуры Вацлаву Ластоўскаму, якому сёлета, 20 кастрычніка, споўніцца 120 гадоў ад дня яго нараджэння. Вацлаў Ластоўскі - вядомы гісторык, публіцыст, пісьменнік, літаратуразнавец і грамадска-палітычны дзеяч.

Язэп Лёсік 1883 - 1940

Да юбілею мовазнаўца

6 лістапада будзе 120 гадоў з дня нараджэння Язэпа Лёсіка. ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" распачало ўшанаванне памяці празаіка, публіцыста, мовазнаўца, літаратуразнаўца і палітычнага дзеяча выданнем кішэннага каляндарыка на 2003-2004 гг. Выкарыстана фота Язэпа Лёсіка 1930-х гадоў з сямейнага архіву дачкі Алесі Лёсік.

Дызайн выканаў мастак Ігар Марачкін. Запытвайце памятныя мастацкія каляндарыкі ў сядзібе Таварыства беларускай мовы, што на вуліцы Румянцава, 13 у Менску.

Ірына Ляксеева.

Віншуем сяброў Таварыства, якія нарадзіліся ў ліпені

Пятра Бацяна
Святлану Бельскую
Уладзіміра Бубешку
Яўгена Васільца
Вінцука Вячорку
Сяржука Гайко
М.У. Грынько
Сяргея Гуркова
Іну Дрожынаву
Наталлю Зяляпкевіч
Паўла Знаўца
Ірыну Кітурку
Валянціну Корзун
Пятра Кухарчыка
Таццяну Місарэвіч
Аляксандра Місцюкевіча
Марыю Мгнарчык
Веру Найдзёнаву
Вольгу Нікаласўскую
Аліну Парда
Таццяну Пашкевіч
Генадзя Пяткевіча
Ядзвігу Раманоўскую
Пятра Русава
Алеся Рымшу
Міколу Савіка
Арцёма Сарокіна
Таццяну Смола
Наталлю Стрыгельскую
Ніну Сыч
Андруся Сяркова
Тамару Талерчык
Веру Трацяк
Генадзя Цыганкова
Васіля Шалупенку
Руслана Шэраверу

Беларусь развіталася з Васілём Быкавым

22 чэрвеня, у гадавіну памяці і смутку па палеглых у другой сусветнай вайне, Беларусь напаткала вялікае гора. Спынілася сэрца салдата, адданага сваёй Радзіме, народнага пісьменніка, сціплага і мудрага Васіля Быкава. Сімвалічна, што яго не стала менавіта ў гэты дзень. Як баец, ён прайшоў ад пачатку і да канца вайны, не раз бачыў смерць, двойчы быў сам паранены. Сваімі неўміручымі творамі на ваенную тэматыку ён здабыў сусветную славу сваёй краіне. Гэта была быкаўская праўда пра вайну. За гэтую праўду ён быў нязручны ўладным структурам. Слава і ганьбаванне ішлі побач праз усё ягонае жыццё. Душэўныя і фізічныя раны падрывалі ягонае здароўе.



Магіла Васіля Быкава на Ўсходніх могілках Менска

Пахаванне Васіля Быкава — апостала Айчыны і сумлення нацыі — адбылося 25 чэрвеня. Гэта падзея ўвойдзе ў найноўшую гісторыю Беларусі, як пахаванне народнага пісьменніка народам. Яно адбывалася так, як таго хацеў сам Васіль Уладзіміравіч і ягоная жонка Ірына Міхайлаўна. Дзесяткі тысяч людзей з кветкамі і жалобнымі бел-чырвона-белымі сцягамі прыйшлі ў Дом літаратара, каб развітацца з вялікім патрыётам. Такая ж палатніна абгарнула труну. Гэта не спадабалася ўрадавай камісіі, і, як сведчаць сродкі масавай інфармацыі, яе старшыня, міністр культуры Ул. Гуляка, пасля адпявання нябожчыка заявіў, што пад такой сімволікай камісія не будзе прымаць удзел у пахаванні. Не было на пахаванні і кіраўніка краіны. Усё гэта ў чарговы раз засведчыла непавагу ўрадаўцаў да асобы Васіля Быкава.

А між тым народ усё прыбываў. Чарга дасягнула нямецкай амбасады.

(Працяг на 3-й ст.)

Удакладненне

У мінулым нумары ў інфармацыі пра ўстаноўку ў Старых Дарогах у прыватным музеі Анатоля Белага памятнага знака Васілю Быкаву была дапушчана тэхнічная недакладнасць. Памятны знак быў устаноўлены ведама ж 19 чэрвеня ў дзень нараджэння В. Быкава.

На здымку: барэльеф на памятным знаку работы Ўладзіміра Мелехава.

Словам на барэльефе: "ВасількОм у жыцці Беларушчыны назаўсёды застанецца Быкаў" наканавана стаць прарочымі.



Не пакідайце ж мовы беларускай

Аб тым, што на беларускім радыё і тэлебачанні мала чаго засталося нацыянальнага, беларускага, пісалася і гаварылась ужо не раз. Але ўсё ж хацелася б яшчэ раз крануцца гэтай тэмы.

І пачаць гэтую размову хацелася б з невялічкага аналізу работы карэспандэнтаў беларускага радыё з пункту гледжання выкарыстання імі роднай мовы ў сваёй працы.

Цікавыя і, у большай частцы, на добрай беларускай мове вядуць свае рэпартажы спадары Палонскі з Берасця, Лазоўскі з Маладзечна, спадарыня Драгайцава з Горадні і некаторыя іншыя журналісты.

Але тут асабняком стаіць карэспандэнт беларускага радыё па Гомельскай вобласці сп. Сенцюроў. Не, яго рэпартажы бываюць часам таксама цікавымі, але калі ён бярэ інтэрвію ў каго-небудзь, то адразу ж пераходзіць на расейскую мову. Пры гэтым вельмі здзіўляе, што інтэрвію ён бярэ ў "чыстакроўных", як гаворыцца, беларусаў, якія добра разумеюць беларускую мову і ў, большасці сваёй, могуць адказваць на ёй перад мікрафонам. Такім чынам, ігнараванне беларускай мовы, у сваёй рабоце зусім не дабаўляе яму аўтарытэту.

Будзем спадзявацца, што сп. Сенцюроў, выправіць гэтыя недахопы ў сваёй рабоце.

Калі ж ацаніць работу беларусага радыё і беларускага тэлебачання, то больш беларускім усё ж з'яўляецца рэспубліканскае радыё. Там ёсць нямала цікавых перадач пра гісторыю нашай краіны, прапагандуецца, хаця і вельмі сціпла беларуская мова.

У заключэнне хацелася б перавесці словы знакамітага Францішка Багушэвіча, якія вынесены ў эпіграф газеты "Наша слова" – "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі".

Святаслаў Маханёк.

Пра беларускасць

Нарэшце, пасля значнага перапынку аднавіў пастаўку спажыўцам малака ў беларускамоўных пакетах ААТ "Магілёўскі малочны камбінат".

На пакетах так і надрукавана "Малако кароўе пастарызаванае" Ну што ж, вітаем кіраўніцтва і спецыялістаў гэтага прадпрыемства з упэўненым крокам да беларускасці. Будзем спадзявацца, што і іншая прадукцыя будзе фасавацца ў беларускамоўныя упакоўкі.

Зараз на Беларусі спякотнае надвор'е, і людзі ў значнай колькасці спажываюць мінеральную ваду каб спатоліць смагу. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца беларусая вада "Дарыда", якая за свае якасці мае нямала ўзнагарод.

Аднак, нягледзячы на тое, што гэтая вада здабываецца з беларускіх нетраў, расфасоўваецца на беларускім жа прадпрыемстве, аднак на этыкетцы гэтай вады няма ніводнага беларускага слова. Па ацэне ёсць, па-расейску ёсць. А вось па-беларуску няма.

Хацелася б спадзявацца, што кіраўніцтва гэтага прадпрыемства і асабіста спадар Далендзік ўнясуць карэктывы ў афармленне этыкеткі гэтай мінеральнай вады і на ёй з'явіцца надпіс "Дарыда" і адпаведны тэкст на беларускай мове.

А гэта дадасць значную колькасць пакупнікоў гэтай патрэбнай многім людзям вады.

Святаслаў Маханёк.

Апошнія словы

Апошнія словы – словы, з якімі мы звяртаемся да нашых, на жаль, памерлых родных. І часцей за ўсё гэты некралог мы бачым на надмагільніках. Але, як паказвае практыка, лічы, што ўсе надпісы на іх зроблены па-расейску ці па-польску. Заўважыў гэтую заканамернасць я тады, калі мне прыйшлося трохі паблукаць па могілках, дзе пахаваныя мае продкі. Рабіў я гэта для таго, каб скласці свой уласны дакладны радавод.

Дык вось што я заўважыў: дзесяткі надмагільнікаў – і ніводнага на матчынай мове... Хаця большасць з тых, хто там ляжыць, амаль усё жыццё размаўлялі менавіта па-беларуску. Вось так мы шануем нашых продкаў, адпраўляючы іх у апошні шлях з чужынскай мовай.

Але чаму так адбываецца? Мо таму, што людзі не хочуць, каб іх магілкі выглядалі нібы "белыя вароны" сярод расейска-польскага дзвюхмоўя, або гэта даніна свае асаблівай модзе, ці проста невыхаванасць беларускага народа ў павазе да роднай культуры.

Калі я апынуўся на тых магілках, мне стала вельмі сорамна і прыкра за свой народ беларускі. Мне здалося на імгненне, што я знаходжуся на мяжы Расеі ды Польшчы, а такой краіны, як Беларусь, увогуле не існуе. Паверце мне, гэта жудасна: стаяць на роднай зямельцы, а адчуваць сябе, як на чужбіне.

Дык кінцем ж браткі-беларусы ганьбіць сваіх памерлых продкаў чужынскай мовай. Ім і так за ўсё жыццё дасталася зпаўна.

І мне застаецца вядомым толькі адно, што невядома, што будзе далей... Але, з намі Бог!

Жыве Беларусь!

З павагай – Дзяшук Юры,
г. Бярозаўка, Лідскі р-н.

Конкурс "Руплiўцы Беларушчыны"

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны запрашае вучняў 9-11 класаў школ, гімназій, ліцэяў, студэнтаў ВНУ і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў да ўдзелу ў конкурсе на лепшы мастацкі ці публіцыстычны твор (эсэ, артыкул, верш, апавяданне), прысвечаны:

165-ым угодкам з дня народзінаў Кастуся Каліноўскага;
140-ым угодкам паўстання 1863 г.;
110-ым угодкам з дня народзінаў Максіма Гарэцкага;
120-ым угодкам з дня народзінаў Язэпа Лёсіка;
100-ым угодкам з дня народзінаў Наталлі Арсенневай.

Працы (1-3 старонкі друкаванага тэксту памерам А-4) высылаць да 15 верасня на адрас: 220005 г. Мінск, вул. Румянцава, 13, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. На асобным лісце пазначце інфармацыю пра сябе: імя, прозвішча, месца вучобы, клас (курс), факультэт, група, адрас, тэлефон, сябрамі якіх грамадскіх арганізацый Вы з'яўляецеся. Ваш удзел у краязнаўчай рабоце.

Пераможцаў чакаюць прызы: магнітафон, кніга Ул. Арлова "Краіна Беларусь", відэа-, аўдыёкасэты, кнігі і інш.

Сакратарыят ТБМ.

А. Р. Лукашэнку, Кіраўніку беларускай дзяржавы.
Копія: Г. В. Навіцкаму, Старшыні Савета Міністраў РБ.
Копія: П. І. Брыгадзіну, Міністру адукацыі РБ.

Паважаны Аляксандр Рыгоравіч!

У апошнія месяцы ціск антыбеларускіх сілаў, якія ставяць на мэце знішчыць беларускую мову і культуру, узмацніўся. Здымаюцца кіраўнікі беларускамоўных школ, ідзе разгром адзінага беларускага па форме і сутнасці ліцэя, беларускую мову нахабна выкідаюць з беларускай чыгункі. Збіраюцца ўвесці новыя грошы, на якіх дзяржаўнай беларускай мове месца ўжо не будзе.

Ці не здаецца Вам, што адзіным адказам незычліўцам, якія гуртуюцца ва ўладных структурах, будзе Ваш указ аб стварэнні з 1 верасня 2003 г. Беларускага Нацыянальнага Універсітэта з выкладаннем усіх прадметаў па-беларуску? Гэта можа быць абгрунтавана тым, што ў гэтым годзе школу скончыла найбольшая за апошнія і будучыя гады колькасць вучняў, што навучаліся на роднай мове, і яны жадаюць вучыцца на ёй і ў ВНУ. Таксама ТБМ мае болей чым 50 тысяч подпісаў грамадзянаў за адкрыццё вышэйзгаданага універсітэта.

Супрацоўнікі Вашай Адміністрацыі добра валодаюць гэтым пытаннем, але ў нас узнікла меркаванне, што ўся дасланая Вам інфармацыя да Вас не трапіла.

Спадзяемся, што Вы, як кіраўнік беларускай дзяржавы, зробіце належныя захады на карысць нашай нацыі.

Надыходзіць час не раскідваць камяні па беларускім полі, а збіраць іх.

Старшыня ГА "ТБМ імя Ф.Скарыны" Алег Трусаў.

Спадару У. Н. Дражыну,
намесніку прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь

Паважаны Уладзімір Несцеравіч!

22 чэрвеня 2003 г. памёр адзін з самых вядомых беларусаў у свеце, народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў.

ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны" прапануе беларускаму ўраду наступныя мерапрыемствы па ўшанаванні яго памяці:

1. Назваць імем пісьменніка адну з самых вялікіх і прыгожых вуліц г. Менска.
2. Усталяваць на доме, дзе ён жыў і працаваў, мемарыяльную шыльду.
3. Узяць пад ахову дзяржавы дом у в. Бычкі Віцебскай вобласці, дзе нарадзіўся і вырас Васіль Быкаў і стварыць там літаратурна-мемарыяльны музей.
4. Да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка выдаць паштовую марку і памятны канверт.

З павагай Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

Заява

Спыніць русіфікацыю беларускай чыгункі

Апошнім часам кіраўніцтва беларускай чыгункі метадычна звужае сферу выкарыстання дзяржаўнай беларускай мовы. Абвесткі ды інфармацыйныя паведамленні ў электрацягніках і на чыгуначных вакзалах, трансляцыя музычных твораў ў пасажырскіх вагонах амаль паўсюдна, на ўсіх кірунках робяцца на іншай мове.

ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" выказвае пратэст супраць такіх дзеянняў і патрабуе неадкладна спыніць дыскрымінацыю мовы тытульнай нацыі і яе носьбітаў, якія складаюць 73,6 % насельніцтва краіны.

Прынята на Сакратарыяце ТБМ 26 чэрвеня 2003 г.

Пастанова

Сакратарыяту ТБМ імя Ф. Скарыны 26 чэрвеня 2003 г.

"Аб скліканні Берасцейскай абласной канферэнцыі ТБМ"

Сакратарыят ТБМ пастанаўляе:

1. Склікаць Берасцейскую абласную канферэнцыю 12 кастрычніка 2003 г. ў Менску.
2. Для вылучэння дэлегатаў на канферэнцыю вызначыць наступныя квоты:
ад гарадскіх і раённых арганізацый, якія стаяць на ўліку ў мясцовых органах улады:
- да 50 чалавек — 1 дэлегат;
- ад 51 да 100 чалавек – 2 дэлегаты;
- ад 101 чалавека і больш – 3 дэлегаты.

Суполкі і арганізацыі, якія не стаяць на ўліку ў мясцовых органах улады, вылучаюць па адным паўнамоцным прадстаўніку з правам дарадчага голасу.

Прынята на Сакратарыяце ТБМ імя Ф. Скарыны 26. 06. 03 г.

Падпіска ў Горадні

Закончылася падпіска на газету "Наша слова" на II паўгоддзе 2003 года. Пры цяперашнім кошце газеты яна нам далася з цяжкасцю.

Абласная і раённая арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны выпісалі 67 экз. газеты "Наша слова" для школаў г. Горадні, Гарадзенскага р-на, раённай бібліятэкі і суполак ТБМ.

Выказваем шчырую падзяку за аказаную фінансавую дапамогу:

1. Зылькову С. П. – 259 200 руб.
2. Шчыглінскому М.С. – 64 800 руб.
3. Будаўніку – 31 000 руб
4. Супрацоўніку аховы прыроды – 30 000 руб.
5. Супрацоўніку раённай асветы – 37 080 руб.


Старшыня абласной Рады ТБМ імя Ф. Скарыны – А. Місцокевіч

Лета ў арганізацыях ТБМ г. Ліды


У межах праекту "Развіццё мясцовых супольнасцяў" Лідскія арганізацыі ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" летам праводзяць шэраг мерапрыемстваў:

- сустрэчы з настаўнікамі беларускай мовы, якія часова засталіся без працы;
- круглы стол з прадстаўнікамі ўлады і СМІ на прадмет працаўладкавання настаўнікаў беларускай мовы;
- сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі;
- святкаванне 10-х угодкаў пастаноўкі помніка Ф. Скарыну ў Лідзе;
- Лідская гістарычная канферэнцыя;
- шэраг мерапрыемстваў па святкаванні 140-х угодкаў паўстання 1863 года.


Інфармацыю пра час і месца правядзення мерапрыемстваў можна знайсці ў Лідскай і Лідскай гарадской арганізацыях ТБМ, а таксама ў рэдакцыі газеты "Наша слова".



Беларусь развіталася з Васілём Быкавым



Развітанне з Васілём Быкавым у Доме літаратара



Жалобная працэсія ў Менску падчас пахавання В. Быкава

З'ехаліся людзі самых розных поглядаў з усіх куточкаў Беларусі, іншых краін. Сярод іх сотні сяброў Таварыства беларускай мовы, кіраўнікі нашых буйных арганізацый. І нягледзячы на тое, што час грамадзянскай паніхіды быў падоўжаны на адну гадзіну, тысячы грамадзян не паспелі развітацца з пісьменнікам. Гэтыя людзі з удзячнасцю прымалі газеты "Наша слова" і "Новы час", якія прапаноўваў прысутным старшыня ТБМ Алег Трусаў. Разышлося амаль 1000 асобнікаў.


Падчас грамадзянскай паніхіды, якую вёў старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, у ліку іншых, выступілі Генадзь Бураўкін, Радзім Гарэцкі, старшыня Маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі, прадстаўнік нямецкай грамадскасці. Першым слова ўзяў адзін з блізкіх сяброў пісьменніка паэт Рыгор Барадулін. Як заўсёды, ён выказаўся коратка і ёмка, прачытаўшы ўласны верш. Для Рыгора Барадуліна Бог, маці і Быкаў — гэта тое, што ён пранясе праз усё сваё жыццё. Паэт Генадзь Бураўкін у сваім развітальным слове сказаў, што ён не пагаджаецца з мудрым выказваннем пра тое, што няма прарокаў у сваёй Айчыне. Жыццё і геній Быкава даказвае адваротнае. Васіль Быкаў быў і застанецца прарокам у Беларусі. Радзім Гарэцкі згадаў грамадскую дзейнасць Васіля Быкава, які стаяў ля вытокаў утварэння Беларускага Народнага Фронту і быў яго духоўным лідарам. "Вялікі беларус, ён поўнасцю аддаў сябе дзеля росквіту Беларусі. Праз сотню гадоў наш час назавуць эпохай Васіля Быкава", — зазначыў акадэмік Гарэцкі.

Труну з целам Васіля Быкава неслі на руках ад Дома літаратара да плошчы Якуба Коласа. Народ упершыню прадэманстраваў, як трэба ўшаноўваць вялікіх сыноў краіны. Амаль 9 кіламетраў прайшлі людзі да Усходніх могілак з кветкамі, вянкамі і сцягамі.


Магіла Васіля Быкава знаходзіцца пры ўваходзе злева, насупраць пахавання Івана Чыгрынава. На месцы апошняга прыстанку пісьменніка ўзвышаецца гара з жывых кветак і вянкоў.

Беларусь развіталася з геніем. Але духоўна ён будзе заўсёды з намі ў сваіх творах. Смерць зрабіла нас іншымі. Яна паяднала партыі, рухі, згуртавала беларускую нацыю і засведчыла, што жыве дэмакратычная інтэлектуальная Беларусь.

Ірына Ляксеева.
Здымкі Уладзіміра Хрышчановіча.



Жалобная працэсія ў Менску падчас пахавання В. Быкава



Жалобная працэсія ў Менску падчас пахавання В. Быкава

СПАЧУВАНЬНЕ

Нью-Ёрк, 23 чэрвеня 2003 г.

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку, Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ды Кааліцыя ў Абарону Дэмакратыі й Правоў Чалавек ў Беларусі выказваюць сям'і сьветлай памяці Васіля Быкава і ўсім, хто смуткуе з прычыны ягонай сьмерці, шчырыя спачуваньні.

Памяць пра памерлага будзе вечнай, бо Васіль Быкаў, як беларус і як пісьменьнік паставіў свой шчодры талент і сваю валатоўскую працавітасьць на службу вечна каштоўным ідэалам – мастацкай праўдзе ды чалавечай і нацыянальнай годнасьці.

Васіль Быкаў, як ніхто зь ягоных папярэднікаў, паставіў на карту сьвету імя Беларусі ды імкненьні беларусаў да свабоды, дэмакратыі й дабраабыту.

Імя Васіля Быкава будзе вечна жыць у сэрцах нашчадкаў. Па кнігах пісьменьніка яны будуць пазнаваць мінуўшчыну свайго народу ў ягонай абароне няўміручасьці Бацькаўшчыны.

Падпісалі: Вітаўт Кіпель,
Антон Шукелайць,
Аляксандар Сільвановіч,
Янка Запруднік.

Спачуваньне-развітаньне з Васілём Быкавым

Трагічная вестка прыйшла да беларусаў Канады.

Зь вялікім болем яна адгукнулася ў нашых душах.

Перастала біцца Сэрца Васіля Быкава.

Сэрца – якое асьвятляла Шлях усім беларусам, дзе б яны не жылі.

Тут за мяжой, у шматнацыянальнай Канадзе, мы ганаарымся, што мы – суайчыньнікі Васіля Быкава.

Ён – наш нацыянальны гонар, нашае сумленне і нашая памяць.

У гэты трагічны для нас час, сябры Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва ў Канадзе схіляюць галовы і далучаюць свае глыбокія спачуваньні да галасоў з усіх канцоў сьвету ў падтрымку жонкі, Ірыны Міхайлаўны, і ўсіх родных і блізкіх Васіля Быкава, тых, хто ведаў і любіў яго і ягоныя творы.

Ваш боль – наш боль.


За сяброў БІНіМу ў Канадзе падпісалі:
Старшыня БІНіМу ў Канадзе: Зіна Гімпялевіч;
Сакратар БІНіМу ў Канадзе: Ірына Верабей.

Музычная рэтраспектыва

Так пачыналя легенда "N.R.M."

Вядома, што любімы беларускай моладдзю гурт "N.R.M." хутка адзначыць свой дзесяцігадовы юбілей. А колькі ж будзе "N.R.M.", калі ўлічваць і творчы стаж гурта "Мроя" — легендарнага яго папярэдніка? Але хай пра гэта думаюць самі музыкі...

Мы ж адзначым, што



гурт "N.R.M." дзесяць гадоў таму пачынаўся з першых альбомаў "La-La-La-La" і "Одзірыдзідзіна". Нажаль, з іх стылявымі асаблівасцямі музычныя крытыкі знаёмілі слухачоў не шмат. Вось гэты прабел і вырашылі мы ліквідаваць. Няхай гэтыя рэтраспектыўныя нататкі стануць падарункам да юбілею каманды разам з трыб'ютам гурта "N.R.M.", які будзе выдадзены ў хуткім часе БМА-group.

Пасля таго, як культавая "Мроя" ў 1994 годзе магічна перарадзілася ў новы гурт "N.R.M.", шматлікія прыхільнікі беларускага хард-року набылі сатысфакцыю ў выглядзе новай, але пакуль малавядомай музычнай фармацыі. І наступным пытаннем, нават загадкай для фанаў было тое, а што ж прапануе ім "N.R.M." у якасці знаёмства? Адказ на яго быў дадзены ў выглядзе альбома з несур'ёзнай назвай "La-La-La-La".

Памятаю, як сам – стары прыхільнік "Мроі", з трымценнем у сэрцы ставіў на прайгравальнік першы "энэрэмаўскі" альбом, да зместу якога было столькі пытанняў. Хто такі гэны тып — Піт Паўлаў? Як справы ў яго з гітарным ўзроўнем? Ці не знікне з гучання нова-га гурта тое, што мы так любілі ў "Мроі" – патрыятычнасць, беларускіх дух ды гук роднага стод-року? Ці будзе "N.R.M." адпавядаць новаму гучанню, якое ўжо пачало дамінаваць у свеце пад уплывам сіетлаўскага саўнду і яго найярчэйшага прадстаўніка і лідара – гурта "Nirvana"?

Першы ж нумар альбома "Белыя лебедзі" паабяцаў і старыя сустрэчы з фальклёрнымі крыніцамі і ўплывамі, і новы пост-гранжавым гук. Да таго ж, гітарыст Піт Паўлаў ужо тады граў ў складзе "N.R.M." абасалютна арганічна, нават больш дасканала чымсці віртуоз В. Смольскі, які граў у "Мроі" апошнім часам...

Што ж тычыцца, патрыятызму, то яго асэнсаванне ў "N.R.M." набыло філасофскае адценне з элементамі крытыцызму: "Нацыя, нацыя, дзе розум твой, дзе рацыя?" ("Нацыя"), "Чакала дарога, чакала дарога нас, а мы гэтым часам бесклапотна пілі смачны квас..." ("Дарога"). Але ад гэтага не прытупілася вастрыня думак і арыгінальных паэтычных вобразаў аўтарства нязменнага Лявона Вольскага. Дарэчы, яго голас займеў на альбоме новыя незвычайныя тэмбры. Пры гэтым дынамічныя перапады ад гроўлу да дысканту абяцалі, што Лявон яшчэ праявіць сябе ў экстрэмальнай стылістыцы напоўніцу.

На альбоме "La-La-La-La" яшчэ было і тое, за што крытыкавалі старую «Мрою» — за дыдактызм у тэкстах і няшчыльнасць аранжыровак. Таму не толькі новыя якасці, але і старыя хібы праявіліся на гэтым альбоме абноўленага гурта: «Паглядзі, што вакол, гэты сьвет супраць нас...» Здаецца, нешта такое мы ўжо неаднойчы чулі з "мроеўскага "рэпертуару. А гэта з песні «Мітусьня». Зрэшты, яна стала своеасаблівым палігонам для далейшага стылістычнага пошуку. Гітарныя сола Піта ў псіхадэлічным стылі ды алеатарычныя вакальныя экзерсісы Лявона гавораць пра пошук таго саўнду, які «закаціць» і старым, і новым слухачам гурта. Тое ж можна казаць і пра твор з правакацыйнай (у станоўчым сэнсе) назвай "Бацька". Тут псіхадэл дамінуе не толькі ў музыцы і аранжыроўцы, але і з'яляецца лейтматывам песенькі.

Затое, рок-н-рольныя тэмы з фолк-рытмам з часоў "Вёскі Дзягцяроўкі" ды "Аўстралійскай полькі", толькі дадавалі гурту аптымізму і ўвагі слухачоў. Можа таму злосная песенька "Зомбі" і сёння ўспрымаецца слухачамі на "ўра". Гэтая кампазіцыя напоўнена метафарычнымі прароцтвамі, якія папярэджвалі нараджэнне эпохі антынацыянальнага рэванцызму ў Беларусі. Як і іншыя "энэрэмаўскія" рок-н-рольныя хіты альбома: "Халі-галі" дый "Ла-Ла-Ла-Ла" (на словы Міхаіла Анемпадыстава). З цягам часу апошняя стала адной з самых заўважных кампазіцый на дыску супольнага праекту "Народны альбом".

Сапраўдным жа прарывам, бадай, новым словам у беларускай рок-музыцы стала, на першы погляд, несур'ёзная песня "Трактар". У ёй можна пачуць тое, што стала дамінаваць у творчасці гурта "N.R.M." больш пазнейшага ўзору – хітовыя мелодыя, якая пакладзена на "цяжкія" гітары і выбуховыя бубны. У той жа час, стылістыка спявання "Трактара" больш нагадвала чытанне рэпу ў гурце, якія арыентуецца на hardcore. Дый мелодыка кампазіцыі "N.R.M." манатоннапавольная, з арсеналу industrial'у, у той жа час, з выразнымі "мэталічнымі" акцэнтамі. Нездарма ж, гэтая кампазіцыя ўважалася прыхільнікамі навамодных hardcore і industrial, як за ўзорную па стылістыцы і аранжыроўцы і неаднойчы калькавалася ў выглядзе кавераў...


Безумоўна, першы альбом гурта "N.R.M." "La-La-La-La" адрадзіў надзею прыхільнікаў беларускамоўнай цяжкай рок-музыкі на тое, што іх чакаюць новыя адкрыцці ў выглядзе творчасці "N.R.M." — спадкаемцы гурта "Мроя".

Наступны крок гурта "N.R.M." быў выяўлены праз год, калі свет пабычыў бадай самы амбіцыёзны (зноў жа ў станоўчым сэнсе) альбом гурта сярэдзіны 90-х – "Одзірыдзідзіна". Гэты альбом утрымліваў многія постмадэрнісцкія эксперыменты, якія потым сталі візітоўкай гурта, а таксама стаў пачаткам інтэлектуальнага і музычнага брэнду гурта "N.R.M.".

Ну, сапраўды, з гэтага альбома, мяркую, пачалася рэалізацыя ідэі Незалежнай Рэспублікі Мроя і паўстанне яе сімвала – вольнай птушкі Одзірыдзідзіны, пачалася палітычная кар'ера яе першых грамадзянаў – міністра турызму і адпачынку (бубнача Алега Дземідовіча), міністра па барацьбе з карупцыяй (басіста Юрася Ляўкова), міністра прапаганды (гітарыста Піта Паўлава) і міністра працы і адпачынку (тэкставіка, гітарыста і вакаліста гурта Лявона Вольскага). "Дзікая "Post'R". Але ў іх ёсць і рацыя: энергічная і бударажная музыка гурта вельмі ўплывала на светапогляд тых, хто пасля складаў аснову "Маладога фронту", "Маладой грамады", "Зубра"...

Так, гэты альбом прапанаваў беларускім слухачам нізку канцэптуальных гітоў, якія яшчэ доўгія гады будуць вызначаць адносіны да творчасці гурта, незалежна ад сэнсу і стылістыкі наступных альбомаў.

Першы з такіх гітоў – "Партызанская" песня. Яе ўпадабалі тыя, хто асэнсаваў сваё становішча, як жыццё пасярод антыбеларускай Матрыцы. Бо яна апанавала ўсе бакі чалавечага і грамадскага жыцця (TV, FM, друк, школа, ВНУ, войска, урадавыя ўстановы), дзе шматаблічныя "агенты Кузнецовы" вышчэрваюцца з абалонкі кожнага паспалітага беларуса. "Партызанская" – музычны сцяг тых маладых хакераў, якія больш за жыццё сцерагуць і абараняюць свой беларускі Зыён. Што казаць пра гэтую моц, калі Беларускае тэлебачанне трансьлявала тэлевізійную версію твора з мэтай прыцягнуць увагу моладзі да перадвыбарчых праграм кандыдатаў ад улады...



энергія гітарыстаў, усепранікальная магутнасць патрыятычнага пафасу, слёзы пасля праслухоўвання "Партызанскай" і жаданне пайсці на бясплатныя курсы ды-джэя беларушчыны..." Вось такімі іранічнымі адзнакамі суправаджаў жыццё гэтага альбома гурта "N.R.M." беларускі часопіс

З гэтага кшталту і энергічная кампазіцыя "Мы самі па сабе". Вядома, "Самі па сабе" – пераклад назвы вядомай ірландскай незалежніцкай партыі "Шын Фэйн". Але ў песні "N.R.M." больш развагаў і веры адносна таго, што перамены і ў нас абавязкова адбудуцца: "Не палюбіць мне чужую краіну/ Не зразумець мне варожых людзей/ І не пазбегнуць удара ў спіну/ І не праспаць гістарычных падзей!

Адзін з самых папулярных гітоў альбома "Одзірыдзідзіна" – "Песня падземных жыхароў". Шмат разоў даводзілася бачыць, як пад яе акорды браталіся і маладафронтавец, і прыхільнік расейскага "КиШа", рэпер і панк з "металістам"...Бо ўсе гэтыя прадстаўнікі моладзевай субкультуры, палітычных суполак учора і сёння знаходзяцца калі не ў апазіцыі да рэальнасці, дык дакладна ў глыбокім андэграўндзе – у культурным і сацыяльным "падзямеллі". Там свае законы, сімвалы, ідэалы і гімн – "Песня падземных жыхароў".

Кантрастам рытмічным і энергічным "энэрэмаўскім" творам трэба адзначыць геніяльную ў сваёй дэпрэсіўнасці песню Л. Вольскага "Лепей ня будзе". Сапраўды, павярхоўны сэнс твора – падстава для суму ў самоце. Але калі супердасканалая мелодыя твору прымушае праслухоўваць яе па некалькі дзесяткаў разоў, то адбываецца цуд – мінорная мелодыя контраверсіўна нараджае пачуццё здаровага жыццёвага аптымізму. Амаль адпаведна стратэгіі "Адверза" са старажытнаіндыйскай філасофіі: каб пераадолець жыццёвыя цяжкасці, трэба рыхтавацца да горшага. Таму зразумела, пра што так пранікнёна спяваецца ў гэтай песні: "Лепей ня будзе, будзе толькі горш/ Ад панядзелка льецца дробны дождж./ Мора ня будзе, будзе толькі порт./ Бедныя людзі, бедны наш народ."

І як працяг тэмы песімізму і аптымізму – фінальны твор альбома: дурнаватая, але вясёлая песенька "Одзірыдзідзіна", куплет з якой : "Мы закрычым: на абардаж!/ І гэты горад будзе наш." стаўся нават слоганам палітычнай дзейнасці моладзевых дэмакратычных арганізацыяў.

Магчыма, гэтая акалічнасць і спрыяе таму, што афіцыёзам гурт аніяк не прызнаецца за культурную падзею, ігнаруецца з боку сродкаў масавай інфармацыі. Але гэтыя альбомы гурта жывуць сярод беларускай моладзі, нагаваюць ім: не ўсё тое золата, што транслюецца па БТ і гучыць на святочных канцэртах у Палацы Рэспублікі.

Анатоль Мяльгуй.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Алена Анісім, Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 30. 06. 2003 г.
Наклад 2200 асобнікаў. Замова № 1705.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 1030 руб., 3 мес.- 3090руб.
Кошт у розніцу: 175 руб. (у Менску - 185 руб.)